# Аднаўляючы лясы, захоўваем прыроду

28 сакавіка супрацоўнікі Полацкага ЦСМС прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі "Дай лесу новае жыццё!", якая стартавала 21 сакавіка і працягнецца да 12 красавіка.

Гэтая значная ініцыятыва стала добрай традыцыяй для нашага рэгіёну. На гэты раз мы правялі пасадку маладога лесу ў квартале 146 выдзелу 12 у Гаранскім лясніцтве Полацкага лясгаса. Удзел у падобных акцыях не толькі прыносіць радасць, але і дазваляе нам унесці рэальны ўклад у адраджэнне і прымнажэнне ляснога фонду Беларусі - аднаго з нашых асноўных багаццяў.

Прыемна ўсведамляць, што штогадовая пасадка лесу стала ўсебеларускай традыцыяй, якая аб'ядноўвае працоўныя калектывы і натхняе ўсіх нас на клопат аб прыродзе.

Далучайцеся да нас і ўносіце свой уклад у абарону навакольнага асяроддзя! Разам мы можам зрабіць больш!